Источник: "Наша слова" - 2014-04-23

80 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Конана

КОНАН Уладзімір нарадзіўся 23 красавіка 1934 года ў вёсцы Вераскава Навагрудскага раёна. Беларускі філосаф, гісторык, культуролаг, літаратурны крытык. Доктар філасофскіх навук па спецыяльнасці эстэтыка (1982). Скончыў БДУ (1959), працаваў настаўнікам і дырэктарам Страшэўскай 8-гадовай школы, пазней - у Інстытуце філасофіі і права АН БССР; доктарская дысертацыя прысвечана тэме: "Станаўленне і развіццё эстэтычнай думкі на Беларусі з X стагоддзя па 1917 год". З 1991 загадчык аддзела гісторыі і тэорыі культуры Нацыянальнага навукова-асветніцкага цэнтра імя Ф. Скарыны. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі 1984 за ўдзел у напісанні цыкла калектыўных манаграфій па гісторыі філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі (апублікаваны ў 1973-1980). Даследуе тэарэтыка-метадалагічныя праблемы філасофіі і культуралогіі, гісторыю эстэтычнай думкі, гісторыю беларускай культуры, беларускі фальклор, гісторыю і сучасны стан беларускай літаратуры, пытанні фалькларыстыкі і літаратуразнаўства Беларусі, архетыпы і сімвалы беларускага мастацтва, праблемы рэлігіязнаўства. Аўтар прац "Развіццё эстэтычнай думкі ў Беларусі (1917-1934 гг.)" (1968), "Ад Рэнесансу да класіцызму" (1978), "Ля вытокаў самапазнання: Станаўленне духоўных каштоўнасцей у святле фальклору" (1989), "Святло для людзей: Родная мова і культура ў эпоху перабудовы" (1989), "Боская і людская мудрасць: Францыск Скарына: жыццё, творчасць, светапогляд" (1990), "Святло паэзіі і цені жыцця: Лірыка Максіма Багдановіча" (1991) і інш. Апошнія манаграфіі: "Ксёндз Адам Станкевіч і каталіцкае адраджэнне ў Беларусі. - Мн, Выд. "Про Хрысто", 2003; "Беларуская мастацкая культура эпохі Сярэдневякоўя і Рэнесансу". - Мн., Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка, 2006.

Уладзімір Конан памёр уноч з 5 на 6 чэрвеня 2011 г. "Патрыярха беларуская філасофіі" не стала на 78 годзе жыцця.

Вікіпедыя.

"Наша слова". 80 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Конана